3. Занимательное азбуковедение / сост. В. В. Волина. — М. : Просвещение, 1991. — 368 с.
4. Всё для детей. Детские игры, занимательные задачи, песни, картинки, обучающие материалы, тесты, поделки [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://allforchildren.ru. — Дата доступа: 26.02.2016.
5. *Османова, Г. А.* Новые игры с пальчиками для развития мелкой моторики: Картотека пальчиковых игр / Г. А. Османова. — СПб. : КАРО, 2008. — 160 с.
6. *Зубкова, Л.* Апельсин. Считалка / Л. В. Зубкова. — М. : Малыш, 1975. — 4 с.
7. Малышок: Песенки, потешки, сказки, стихи, рассказы / сост. Р. М. Миронова. — Минск : Юнацтва, 1986. — 271 с.
8. Теремок. Детские игры в Теремке [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.teremoc.ru. — Дата доступа: 04.05.2016.
9. *Ушаков, Н. Н.* Занимательный материал к урокам русского языка в начальных классах : пособие для учителей / Н. Н. Ушаков. — М. : Просвещение, 1967. — 207 с.
10. Как мужик гусей делил. Сказка / обработка А. Н. Толстой // Самые умные сказки. — М. : Книга, 2010. — 128 с.
11. У ребёнка тоже есть права. Конспект мероприятия для педагогов дошкольных образовательных учреждений / Т. Кириллова // Международный образовательный портал [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.maam.ru. — Дата доступа: 04.05.2016.
12. *Черницкая, И.* Колыбельная для мама / И. Черницкая // Школа радости [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://happy-school.ru. — Дата доступа: 04.05.2016.
13. *Богуславская, Н. Е.* Веселый этикет (развитие коммуникативных способностей ребенка) / Н. Е. Богуславская, Н. А. Купина. — Екатеринбург : АРГО, 1997. — 192 с.
14. *Анискевич, С. С.* Кем вырастут дети? Дополнительный материал к картинкам по развитию речи учащихся 1–2 классов / С. С. Анискевич. — Минск : Народная асвета, 1994. — 160 с.
15. *Барто, А. Л.* Любимые страницы / А. Л. Барто. — Смоленск : Русич, 1998. — 272 с.
16. Классный час. Права ребёнка // Кладовая развлечений. Сайт для педагогов, воспитателей, студентов, родителей [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://kladraz.ru. — Дата доступа: 04.05.2016.
17. День знаний для первоклассников. Сценарий праздника / А. Рудова // Солнышко [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.solnet.ee/holidays/s6_54.html. — Дата доступа: 04.05.2016.
18. Организованные этапы урока. Методическая разработка [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://infourok.ru/metodicheskaya-razrabotka-organizovannie-etapi-uroka-648984.html. — Дата доступа: 26.02.2016.
19. *Берестов, В.* Читалочка. Стихи / В. Берестов. — М. : АСТ, Астрель, 2011. (Планета детства.) — 128 с.



***О. И. Тиринова,***
*кандидат педагогических наук, доцент,*
*автор УМК «Введение в школьную жизнь»*


# Беларуская мова. II клас
# (для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання)

## Урокі па новай вучэбнай праграме

### Урок 22. Беларускі алфавіт

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне правільна называць літары беларускага алфавіта, размяшчаць словы ў алфавітным парадку, ажыццяўляць пошук слоў у слоўніку з дапамогай алфавіта; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў лексікасемантычнай групай «школьныя прылады»; выхоўваць любоў да працы, жаданне вучыцца.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі; арфаграфічныя слоўнікі; рабочы сшытак (Свірыдзенка В. І. Беларуская мова. 2 клас: рабочы сшытак : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Аверсэв, 2016. — 128 с.)

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Праверка дамашняга задання.**

— Якая назва школьнай прылады ў вас атрымалася? Прачытайце сказ, які вы запісалі. Лічбы 1, 2, 3, 4, 5 расстаўце над назвамі школьных прылад так, каб яны размяшчаліся ў алфавітным парадку.

**3. Замацаванне.**

**3.1. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы зроблены наступны запіс:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| в | ў | ю | п | е |
| ч | д | м | х | й |

— Назавіце і дапішыце «суседзяў» літары ў алфавіце. (Той з вучняў, хто першым правільна называе літары, суседнія з літарай *в*, выходзіць да дошкі і ўпісвае гэтыя літары ў адпаведныя квадрацікі. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі літарамі.)

**3.2. Праца ў парах.**

— Назавіце адзін аднаму ўсе літары беларускай мовы ў алфавітным парадку. Для чаго трэба ведаць алфавіт?

— Знайдзіце ў арфаграфічным слоўніку словы ***дождж, дзверы, дзяўчынка***. Якое з іх пададзена ў слоўніку першым? Другім? Трэцім? Чаму?

**3.3. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісаны верш:

**Ягадныя месяцы**

Чэрвень спеліць
чорныя чарніцы.
Ліпень дорыць
зорныя маліны.
Жнівень запрашае
браць брусніцы,
верасень прыносіць
журавіны.

*Міхась Пазнякоў* [1, с. 76]

— Паслухайце верш. Чаму ён мае такую назву? Знайдзіце і прачытайце ў вершы, калі спеюць суніцы... чарніцы... маліны... брусніцы... журавіны. Выпішыце з верша назвы месяцаў года ў алфавітным парадку. Падкрэсліце назву таго месяца, калі дзеці ідуць у школу. Лічбы 1–4 расстаўце над словамі — назвамі ягад так, каб яны размяшчаліся ў алфавітным парадку.

***Фізкультхвілінка.***

**3.4. Праца па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі, на якіх намалявана крыжаванка і запісаны словы:

*дзённік, буквар, закладка, клей, кардон*




— Размясціце словы ў алфавітным парадку. Упішыце паслядоўна словы ў крыжаванку. (Пры размяшчэнні па алфавіце слоў, якія пачынаюцца з адной і той жа літары звяртаецца ўвага на другую літару ў слове і на яе месца ў алфавіце.)

— Якім па памеры можа быць рукзак? Як яшчэ можна назваць маленькі рукзак? Запішыце гэтае слова.

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 57.

**3.5. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісаны верш:

**Хто чым займаўся**

Марына чытала буквар.
Карабель майстраваў Макар.
А капрызуля Валерка
капрызнічаў над талеркай.

*Анатоль Зэкаў [2, с. 10]*

— Прачытайце верш. Хто з дзяцей займаўся добрай справай? Што рабіла дзяўчынка? Што такое буквар? Як яшчэ называюць кнігу, па якой дзеці вучацца чытаць? Выпішыце з верша ў алфавітным парадку імёны дзяцей.

**4. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

Вучням раздаюцца карткі з заданнем:

Палачкі чароўныя
пакідаюць след,
імі каляровы
мы ствараем свет.

*Станіслаў Валодзька*
[3, с. 6]

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 13 | 16 | 22 | 12 | 10 |
| | | | | | |

Адна нага
на месцы стаіць,
другая —
вакол першай бяжыць.

*Уладзімір Мацвеенка*
[4, с. 60]

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 25 | 25 | 18 | 12 | 21 | 13 | 29 |
| | | | | | | |

— Прачытайце загадкі. Расшыфруйце і запішыце словы-адгадкі (лічбы ў клетках указваюць на парадкавы нумар літары ў алфавіце).

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 58.

**5. Падвядзенне выніку ўрока.**

— Для чаго трэба добра ведаць алфавіт? У якім парадку размешчаны словы ў арфаграфічным слоўніку?

**6. Рэфлексія.**

Падрыхтавала **В. І. Свірыдзенка**

## Урок 25. Напісанне вялікай літары ў словах

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне пісаць з вялікай літары імёны, імёны па бацьку, прозвішчы людзей, мянушкі жывёл, геаграфічныя назвы; праводзіць назіранні за правапісам агульных і ўласных назваў, дыферэнцыйнымі напісаннямі; замацоўваць уменне размяшчаць словы ў алфавітным парадку; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў назвамі гарадоў Беларусі; выхоўваць любоў да Радзімы.

***Абсталяванне:*** падручнік, карткі з заданнямі, карта Беларусі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Праверка дамашняга задання.**

Практ. 116.

— Якія гукі часцей за іншыя сустракаюцца ў скорагаворцы? Назавіце словы з гукамі [р], [г].

Некалькі вучняў чытаюць скорагаворку ўслых. Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка скорагаворкі.

— Якія словы ў скорагаворцы напісаны з вялікай літары? Чаму?

— Успомніце, якія словы пішуцца з вялікай літары.

**3. Праца са слоўнікавымі словамі.**

Настаўнік загадвае загадкі, а вучням неабходна запісаць словы-адгадкі, якія з'яўляюцца слоўнікавымі словамі.

Два вучні запісваюць словы з адваротнага боку дошкі. Пасля выканання задання арганізуецца калектыўная праверка.

У другіх крок,
А ў іх падскок. *(Вераб'і.)*
*Паводле Анатоля Клышкі* [5, с. 89]

Хто б сказаць мне мог,
штó ідзе без ног? *(Дождж.)*
*Анатоль Клышка*

Ці малы я, ці вялікі —
Ды заўсёды ўсё ж мяне
Людзі носяць
На спіне. *(Рукзак.)*
*Міхась Пазнякоў* [1, с. 135]

Села Таня маляваць
Ды сяброў сваіх здзіўляць.
— Паглядзіце, на паперы
тры пакоі, калідор,
Кухня, ванна,
Вокны, дзверы
Атрымалася... *(кватэра)*.

**4. Замацаванне.**

**4.1. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісаны спалучэнні слоў:

*выпаў **(С/с)няжок**, сабака **(С/с)няжок***
*кошка **(К/к)нопка**, канцылярская **(К/к)нопка***

— Прачытайце спалучэнні слоў. Растлумачце, з якой літары трэба напісаць выдзеленыя словы. Запішыце спалучэнні слоў, у якіх выдзеленыя словы трэба запісаць з вялікай літары.

— З якой літары трэба напісаць слова *(Л/л)еў*? Чаму? Вусна прыдумайце два сказы, у якіх гэта слова абазначала б імя хлопчыка і назву жывёлы.

**4.2. Самастойная праца па заданні на картках.**

На картках запісаны сказы:

*Антон (Б/б)аравікоў знайшоў пад дубам шмат (Б/б)аравікоў.*

*Брат (Г/г)леб старанна даглядае (Г/г)лебу і расліны.*

*У (Ч/ч)эрвені мы ездзілі ў горад (Ч/ч)эрвень.*

— Прачытайце сказы. Закрэсліце непатрэбныя літары.

**4.3. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы прапануюцца рэбусы:

| | | |
|---|---|---|
| я / дзе | р / за | ч / ра |

— Разгадайце рэбусы. Запішыце словы, якія атрымаліся. Растлумачце іх правапіс.

***Фізкультхвілінка.***

**4.4. Праца ў групах.**

На дошцы запісана слова *Паліна*.

— Якія імёны дзяўчынак «схаваліся» ў слове *Паліна*? Запішыце іх ў алфавітным парадку.

Пасля выканання задання арганізуецца праверка. Прадстаўнік адной групы зачытвае словы, размешчаныя ў алфавітным парадку (*Аліна, Іна, Ліна, Паліна*). Вызначаюцца групы, якія выканалі заданне без памылак.

**4.5. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісана скорагаворка:

*(У/у)кусіла (А/а)са (А/а)сю.*
*Анатоль Клышка* [6, с. 10]

— Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна яе вымаўляць. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы. Запішыце скорагаворку па памяці.

*Вучні тлумачаць напісанне слоў, правільны запіс фіксуюць на дошцы і падкрэсліваюць вялікую літару ў словах. Вучням прапануецца паўтарыць скорагаворку па памяці. Затым кожны вучань запісвае скорагаворку па памяці, робіць самаправерку і звярае запіс з узорам на дошцы.*

**4.6. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісана загадка:

Сталіца роднай Беларусі,
Але адразу назавуся
Палескім горадам табе,
Калі заменіш **М** на **П**.
*Уладзімір Мазго* [7, с. 115]

— Прачытайце і адгадайце загадку. Чаму слова ***Беларусь*** напісана з вялікай літары? Запішыце словы-адгадкі. Растлумачце іх правапіс.

Настаўнік прапануе вучням знайсці і паказаць на карце Беларусі гарады Мінск і Пінск. Пры неабходнасці настаўнік аказвае дапамогу.

— Назвы якіх беларускіх гарадоў вы ведаеце яшчэ? У якіх гарадах вы былі? Чым славяцца гэтыя гарады?

**5. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

**I варыянт** (вучням раздаюцца карткі з заданнем).

Прачытайце тэкст. Растлумачце, якія літары трэба ўставіць у словы.

*Горад (М/м)інск — сталіца (Б/б)еларусі. Галоўная вуліца горада — праспект (Н/н)езалежнасці. У (М/м)інску працякае рака (С/с)віслач. Наша школа знаходзіцца на вуліцы (К/к)рапоткіна.*

Спішыце сказ з назвай ракі.

**II варыянт.**

Запішыце імёны членаў вашай сям'і ў алфавітным парадку.

З мэтай адпрацоўкі навыку правапісу вялікай літары ў словах вучням можна прапанаваць самастойна папрацаваць з электронным трэнажорам «Напісанне вялікай літары ў словах» (Антановіч, Н. М. Трэнажор «Напісанне вялікай літары ў словах». Беларуская мова. 2 клас / Н. М. Антановіч // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2015. — № 9 (электронны дадатак № 29)).

**6. Падвядзенне выніку ўрока.**

— Якія словы пішуцца з вялікай літары? Прывядзіце прыклады такіх слоў.

**7. Рэфлексія.**

*Падрыхтавала* ***Н. М. Антановіч***

## Урок 32. Склад. Падзел слоў на склады

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне падзяляць словы на склады, вызначаць колькасць і паслядоўнасць складоў у словах; устанаўліваць адпаведнасць паміж колькасцю складоў і колькасцю галосных у слове; практыкаваць у вызначэнні галосных і зычных гукаў у слове, устанаўленні колькасці гукаў і літар, развіваць фанематычны слых; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў назвамі зімовых месяцаў, зімовых з'яў прыроды; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** падручнік, карткі з заданнямі; рабочы сшытак (Свірыдзенка В. І. Беларуская мова. 2 клас: рабочы сшытак : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Аверсэв, 2016. — 128 с.).

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце правільна скорагаворку, якую запісалі ў сшытку. Якое слова паўтараецца ў ёй? Як вы запісалі яго ў першым выпадку? Чаму? Якое поўнае імя ў дзяўчынкі? Як запісалі слова ***сані*** ў другім выпадку? Чаму? Для чаго патрэбныя санкі?

— Колькі складоў у кожным выдзеленым слове? Як вы гэта вызначылі? Якія літары падкрэслілі ў гэтых словах?

Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка скорагаворкі.

**3. Паўтарэнне.**

**3.1. Праца па заданні на картках.**

На картках запісаны верш і склады:

**Завіруха**

Выйшла завіруха пагуляць —
надакучыў ціхі адпачынак.
З ветрам, з карагодамі сняжынак
выйшла завіруха пагуляць.
Дзе гуляла — гурбы там ляжаць,
дываны зіхцяць замест сняжынак.
Выйшла завіруха пагуляць —
надакучыў ціхі адпачынак.

*Мікола Чарняўскі* [8, с. 18]

за ру ха ра сня жын

ві ка год кі

— Прачытайце назву верша. Пра што будзе ісці ў ім размова, мяркуючы па назве? Як выглядае наваколле ў час завірухі? У чым прыгажосць гэтага надвор'я?

— Прачытайце верш. Які малюнак можна намаляваць да яго? Каго нагадвае завіруха ў вершы? Злучыце склады на карках так, каб атрымаліся словы.

**3.2. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы зроблены наступны запіс:

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ты | | дзень | | рань |
| **лю** | | **сту** | дзіць | **шэ** | |
| | ся | | жка | | ры |

— Дапоўніце складамі словы. Прачытайце. Якое слова трэба напісаць з вялікай літары? Запішыце словы, якія ў вас атрымаліся.

— Якое поўнае імя ў дзяўчынкі Люсі? Якія назвы зімовых месяцаў у вас атрымаліся? Якой назвы не хапае? Запішыце слова ***снежань***, вызначце ў ім колькасць складоў.

**3.3. Праца па заданні на картках.**

На картках запісаны верш:

Ходзіць **студзень**,
**студзіць** студзень,
цэлы **месяц** холад будзе.
**Вецер зябкі** шуміць,
а мароз яшчэ трашчыць.

*Авяр'ян Дзеружынскі* [9, с. 47]

— Прачытайце верш. Якое надвор'е бывае ў студзені? Падкрэсліце ў выдзеленых словах літары галосных гукаў. Падзяліце гэтыя словы на склады вертыкальнымі лініямі.

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 82.

***Фізкультхвілінка.***

**3.4. Праца па заданні на картках.**

На картках запісаны склады і зроблены малюнак снега:

| | | |
|---|---|---|
| жын сня ка | ____________ | Малюнак: снег. |
| сне вік га | ____________ | |
| кі снеж | ____________ | ____________ |
| Сня ка гур | ____________ | |

— Памяняйце месцамі склады і запішыце словы. Што аб'ядноўвае ўсе гэтыя словы? Падпішыце адпаведным словам малюнак. Падкрэсліце ў словах літары галосных гукаў. Абазначце лічбамі над словамі колькасць складоў.

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 84.

**3.5. Самастойная работа.**

На дошцы запісаны словы:

| | | | |
|---|---|---|---|
| нара — | ____________ | зала — | ____________ |
| рака — | ____________ | мала — | ____________ |
| рама — | ____________ | ласі — | ____________ |

— Прачытайце словы. Памяняйце месцамі склады ў іх і запішыце новыя словы. Колькі складоў у кожным запісаным слове?

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове:练. 85.

**4. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

Вучням раздаюцца карткі з заданнем.

Прачытайце і адгадайце загадку. Падпішыце словы-адгадкі пад адпаведнымі малюнкамі. Падкрэсліце ў іх літары галосных гукаў.

Слова гэта, пэўна, знаеш?
Азначае аўтагонкі.
Літары як пераставіш —
Інструмент музычны, звонкі.
*Уладзімір Мацвеенка*
[10, с. 95]

| Малюнак: ралі. | Малюнак: ліра. |
| --- | --- |
| ________ | ________ |

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 58.

**5. Падвядзенне выніку ўрока.**

— Як даведацца, колькі ў слове складоў? Прывядзіце прыклады слоў з аднаго склада, двух складоў, трох, чатырох.

**6. Рэфлексія.**

*Падрыхтавала* ***В. І. Свірыдзенка***

## Урок 38. Націск

***Мэты:*** замацоўваць уменне вызначаць націскны склад у словах, назіраць за несупадзеннем націску ў рускіх і беларускіх словах; практыкаваць у вызначэнні галосных і зычных гукаў у слове; развіваць фанематычны слых; узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў лексікасемантычнымі групамі «посуд», «ежа»; выхоўваць культуру паводзін за сталом.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі; малюнкі вядзерцаў і рыбак са словамі (суп, кампот, дранікі, бліны, пірог, катлета, смятана, бабка, халадзец, ёгурт, сасіска, каўбаса); рабочы сшытак (Свірыдзенка В. І. Беларуская мова. 2 клас: рабочы сшытак : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Аверсэв, 2016. — 128 с.); карткі са слоўнікавымі словамі (Свірыдзенка В. І., Антановіч Н. М. Слоўнікавыя словы. 2 клас : карткі-заданні / В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч. — Мінск : Аверсэв, 2013. — 64 с.).

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Праверка дамашняга задання.**

**2.1. Праверка практ. 175.**

— Прачытайце словы, якія ў вас атрымаліся. Назавіце ў іх націскныя склады. Які склад у слове называецца націскным?

**2.2. Праца са слоўнікавым словам.**

Дзецям раздаюцца карткі, на якіх запісаны сказы:

*Маленькая талерка — гэта* ____________.
*Вялікая* __________ *— гэта блюда.*

— Дапішыце патрэбныя словы ў сказы.

**3. Замацаванне.**

**3.1. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы прымацаваны малюнкі вядзерцаў (на кожным вядзерцы стаіць адна з лічбаў 1, 2 або 3) і рыбак са словамі ***суп, кампот, дранікі, бліны, пірог, катлета, смятана, бабка, халадзец, ёгурт, сасіска, каўбаса***.

Да дошкі выклікаюцца тры вучні. Першы вучань прымацоўвае да вядзерца рыбак са словамі, у якіх націск падае на 1-шы склад, другі — з націскам на 2-м складзе, трэці — з націскам на 3-м складзе. Вучні кожнага рада спісваюць аднаскладовыя, двухскладовыя і трохскладовыя словы (праца арганізуецца па варыянтах).

**3.2. Калектыўная праца па заданні на картках.**

Вучням раздаюцца карткі з вершам:

**Дзедаў крупнік**

Ах! — гарачы, ох! — духмяны,
Смачны **крупнічак** аўсяны!
Ён смятанкаю заліты —
Есць Валера з апетытам.
Дзед **жартуе**: — Еш да дна,
Бо ёсць **прымаўка** адна:
«Хто да дна **талеркі** дойдзе,
Той сваё здароўе знойдзе»
*Уладзімір Мацвеенка* [4, с. 13]

— Прачытайце верш. Які суп называюць крупнікам? Прачытайце прымаўку, якая сустрэлася ў вершы. Чаму так гавораць? Пастаўце націск у выдзеленых словах. Падкрэсліце націскныя склады.

***Фізкультхвілінка.***

**3.3. Калектыўная праца па заданні на дошцы.**

На дошцы запісаны вершаваныя радкі:

Адышоў я ад пліты,
кажу Вары:
— Ты вары.

Бульбы поўныя кашы
мы паставім на мяжы.

Я для Пашы
звару кашы.
*Н. Сторажава* [11, с. 50]

— Прачытайце. Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца націскам. Пастаўце націск у гэтых словах. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

**3.4. Праца са слоўнікавым словам *відэлец*.**

На дошцы рэбус:

| ***я = і*** | | ***а = э*** |
| --- | --- | --- |
| Малюнак: вядро | ,, , | Малюнак: палец |

— Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася. Вымавіце слова па складах. Слова ***відэлец*** — слоўнікавае, напісанне яго трэба запомніць. Запішыце яго яшчэ раз, падзяляючы рыскамі на склады.

Дзецям раздаюцца карткі для самастойнай працы:

*Калі накрываюць на стол, то* малюнак відэлец *кладуць злева ад* малюнак талерка*, а нож — справа.*

— Дапоўніце сказ патрэбнымі слоўнікавымі словамі. Пастаўце ў іх націск. (Пасля выканання задання адзін з вучняў чытае сказ і дагаворвае патрэбныя словы, называе ў іх націскныя склады. Астатнія дзеці сочаць, ці правільна вымаўляюцца словы па-беларуску, ці так выканана заданне. Пасля чытання дзеці называюць і выпраўляюць памылкі ў вымаўленні слоў.)

Праца можа быць арганізавана пры дапамозе картак-заданняў (с. 23).

**4. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

Вучням раздаюцца карткі з заданнем:

Мы з сястрою Таняй
на ка-та-ма-ра-не.
Кажу **(Т, т)ані**:
— Не **(Т, т)ані**.
А яна мне:
— Не дражні.

*Н. Сторажава* [11, с. 50]

— Прачытайце. Закрэсліце непатрэбныя літары ў дужках. Пастаўце націск у выдзеленых словах. Растлумачце правапіс вялікай літары.

Праца можа быць арганізавана ў сшытку на друкаванай аснове: практ. 97.

**5. Падвядзенне выніку ўрока.**

— Які склад у слове называецца націскным? Прыдумайце два словы, якія пішуцца аднолькава, а адрозніваюцца націскам.

**6. Рэфлексія.**

*Падрыхтавала **В. І. Свірыдзенка***

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. *Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў ; маст. С. Волкаў. — Мінск : Литература и Искусство, 2009. — 144 с.
2. *Зэкаў, А.* Вожык вёз сараканожак: вершы : для дзяцей мал. шк. узросту / А. Зэкаў ; маст. В. Міронцава. — Мінск : Звязда, 2014. — 32 с.
3. *Валодзька, С.* Палачкі чароўныя... / С. Валодзька // Вясёлка. — 2008. — № 6. — С. 6.
4. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка: вершы, загадкі, казкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
5. *Клышка, А. К.* Тысяча арэшкаў : загадкі для дзяцей і дарослых / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 2012. — 127 с.
6. *Клышка, А. К.* Прыгаршчы языкаломак / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета. — 2011. — 31 с.
7. *Мазго, У. М.* Таямнічая планета. Вершы, казкі, загадкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Уладзімір Мазго ; маст. Валянціна Макаранка. — Мінск : Литература и Искусство, 2008. — 120 с.
8. *Чарняўскі, М.* Завіруха / М. Чарняўскі // Вясёлка. — 2009. — № 1. — С. 18.
9. *Дзеружынскі, А.* З любоўю да мовы : практычны матэрыял для настаўнікаў пачатковых класаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі вучэбна-метадычны цэнтр, Віцебскі інстытут удасканалення настаўнікаў ; склад. І. А. Гімпель, Г. В. Нарубіна. — Мінск, 1992. — 187 с.
10. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка: Вершы, загадкі, казкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
11. *Сторажава, Н. А.* Мова мая і твая: Вучу дзяцей па-беларуску. — Мінск : выд. А. Ванін, 1993. — 80 с.


***В. І. Свірыдзенка****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ;*
***Н. М. Антановіч****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*